# СЯМ'Я ЯК СПЕЦЫФІЧНАЕ АСЯРОДДЗЕ ДЛЯ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАУ

**Чэчат В. У.**
*Нацыянальны інстытут адукацыі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выхаванне патрыятычнай свядомасці, пачуццяў і перакананняў дзяцей ва ўмовах сям'і абумоўліваецца самой сутнасцю і спецыфікай сямейнага выхавання. Пад сямейным выхаваннем як выхаваўчай дзейнасцю бацькоў намі разумеецца ўзаемадзеянне бацькоў і дзяцей, якое заснавана на роднаснай інтымна-эмацыянальнай блізкасці, любві, клопаце, павазе і абароне і якое стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця і самаразвіцця нацыянальна свядомай, духоўна, маральна і інтэлектуальна падрыхтаванай асобы дзіцяці як грамадзяніна-патрыёта, працаўніка і сем'яніна.

Выхаванне грамадзяніна-патрыёта ў сям'і залежыць і ад спецыфічнасці сямейнага выхавання, асноўнымі характарыстыкамі якога з'яўляюцца наступныя:

— садзейнічанне ажыццяўленню непарыўнай сувязі пакаленняў, іх прошлага, сучаснага і будучага, маральнаму адзінству членаў сям'і як людзей і як прадстаўнікоў дзяржавы праз функцыянаванне сям'і як натуральнага альтруістычнага мікраасяроддзя;

— здольнасць непрыкметна (спакваля) пры дапамозе ўнікальнага механізму функцыянавання роднасных сувязей і інстынкту фарміраваць у дзяцей чалавечыя пачуцці да сваіх бацькоў, дзядулі, бабулі, іншых членаў сям'і і праз іх да свайго народа, іншых людзей, усяго чалавецтва, г. зн. агульначалавечыя сувязі прадстаўляюцца дзецьмі перш за усё па аналогіі з сям'ёй, з роднаснымі сувязямі;

— непераўзыдзенасць па свайму эмацыянальнаму «напалу» сямейных зносін, мацярынскіх і бацькоўскіх уражанняў, у цэлым сямейнага ўкладу, што з'яўляецца жыватворнай крыніцай думак, пачуццяў, зносін і адносін дзіцяці ў самым раннім узросце, калі яно па натуры сваёй настолькі ўспрымальна, што набывае багацце гэтых думак, пачуццяў, зносін і адносін з бацькамі, роднымі, блізкімі людзьмі на ўсё сваё жыццё;

— нефармальнасць сямейнага выхавання, якое заснавана на станоўчых традыцыях радаслоўнай, сямейных традыцыях, звычаях, абрадах, прывычках, норавах, укладзе жыцця.

Вывучэнне той катэгорыі беларускіх сямей, якія спрыяльна ў выхаваўчых адносінах уздзейнічаюць на дзяцей, паказвае, што ў іх для выхавання патрыятычнай свядомасці і пачуццяў дзяцей рознага ўзросту назапашаны свае сямейныя сродкі і формы. Сярод іх выдзяляюцца: 1) калыханкі маці і бабулі, іх казкі і песні, у змесце якіх расказваецца аб бацьках, дзецях, родным доме і прыродзе, аб гуманных адносінах да родных і блізкіх людзей, да расліннага і жывёльнага свету свайго краю; 2) гутаркі-ўспаміны бацькоў і родзічаў аб сваім жыцці, дзяцінстве і юнацтве; 3) «апісанне» генеалагічнага дрэва сваёй сям'і; 4) стварэнне сямейных альбомаў, «летапісаў», рукапісных кніг успамінаў; 5) перадача дзецям, унукам і праўнукам сямейных рэліквій; 6) выкарыстанне дакументальных кніг і матэрыялаў для вывучэння гераічнага прошлага сям'і, бацькоў, родзічаў, беларускага народа; 7) сустрэчы ў сем'ях з сябрамі бацькоў па зброі і па сумеснай працы; 8) удзел бацькоў і дзяцей у патрыятычных акцыях і святах, вечарах «Маладосць нашых дзедаў і бабуль (бацькоў і мацярок)»; фестывалях і святах мастацтваў беларускай народнай песні, тан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ца, музыкі, жывапісу; 9) паходы і паездкі па роднаму краю, Беларусі; 10) удзел у правядзенні абрадаў, што звязаны з памінаннем продкаў (на Радаўніцу, Сёмуху, Дзяды), прывядзенне ў парадак магілак і помнікаў; 11) правядзенне вечароў, якія прысвечаны провадам юнакоў на службу ў армію і інш.

Як паказвае вопыт сямейнага выхавання, пры правядзенні работы па выхаванню дзяцей свядомымі патрыётамі, якія з павагай і любоўю адносяцца да бацькоў, сям'і, свайго народа, Айчыны, бацькі патрэбна:

— улічваць традыцыі радаслоўнай і сваёй сям'і;

— улічваць ўзрост дзяцей і іх магчымасці ў ажыццяўленні розных відаў патрыятычнай і працоўнай дзейнасці;

— пазбягаць супрацьпастаўлення ў плане адносін пакаленняў («наша, старэйшае, было самым сумленным, працавітым, свядомым, а вось маладое — зусім іншае»);

— абапірацца на станоўчыя агульначалавечыя якасці ў дзяцей (гуманнасць, дабрата, міласэрнасць, сумленнасць, грамадзянскасць, любоў да бацькоў, людзей, суайчыннікаў, працавітасць і інш.), якія садзейнічаюць збліжэнню, разуменню, узаемадапамозе, імкненню да сумеснай дзейнасці за дабрабыт кожнага члена сям'і, за адзінства і моц сям'і, Айчыны;

— карыстацца яркімі, уражальнымі і бясспрэчнымі прыкладамі з гісторыі Беларусі, з жыццядзейнасці яе знакамітых, славутых, вядомых вучоных, умельцаў, працаўнікоў, абаронцаў Айчыны; прыводзяць іх, калі ёсць магмымасць, з жыцця і дзейнасці прадстаўнікоў радаслоўнай, членаў сям'і, родзічаў, суседзяў;

— звязваць сваю бацькоўскую дзейнасць і дзейнасць дзяцей з канкрэтнай дапамогай і клопатам аб членах сям'і, старых і нямоглых родзічах, ветэранах вайны і працы, дзецях-інвалідах і сіротах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ